# *Профілі музеяў:*

1. гістарычныя:
   а) ваенна-гістарычныя;
   б) баявой славы;
   в) гістарычныя шырокай тэматыкі;
   г) гістарычныя канкрэтнай тэматыкі, у тым ліку:
   - гісторыя населенага пункта,
   - гісторыя школы, вучылішча, тэхнікума,
   - археалагічныя,
   - этнаграфічныя,
   - мемарыяльныя (прысвечаныя жыццю і дзейнасці славутасцей ці гістарычнай падзеі).
2. літаратурныя;
3. навукова-тэхнічныя (прысвечаныя якой-небудзь галіне навукі і тэхнікі);
4. мастацкія:
   - мастацтвазнаўчыя,
   - прыкладнога мастацтва.
5. прыродазнаўчыя:
   - батанічныя,
   - заалагічныя,
   - антрапалагічныя,
   - геаграфічныя,
   - геалагічныя,
   - аховы прыроды.
6. комплексныя краязнаўчыя (музеі, якія маюць экспазіцыі па прыродзе, гісторыі, эканоміцы, культуры роднага краю).

## Да асноўнага фонду маюць дачыненне:

***У музеях гістарычнага і краязнаўчага профілю:***

- археалагічныя матэрыялы, здабытыя ў выніку раскопак, а таксама выпадковыя знаходкі;
- этнаграфічныя прадметы, у т.л. прадметы народнага побыту;
- нумізматычныя прадметы і зборы, прадметы баністыкі, сфрагістыкі, геральдыкі;
- навуковыя і бытавыя прылады і інструменты;
- узоры працы, узоры прадукцыі;
- зброя, сцягі, абмундзіраванне;
- прадметы побыту і адзення, музычныя інструменты;
- творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (жывапіс, скульптура, графіка, у т.л. плакат і інш.), якія маюць дакументальнае, мемарыяльнае ці мастацкае значэнне;
- фатаграфічныя матэрыялы, якія маюць дакументальнае, мемарыяльнае і мастацкае значэнне;
- кнігі рукапісныя, старадрукаваныя, рэдкія выданні XVII – XX ст.ст.;
- рукапісныя і друкаваныя дакументы;
- дакументальныя і мастацкія кінаматэрыялы;
- мемарыяльныя прадметы дзяржаўных і грамадскіх дзеячоў, выдатных прадстаўнікоў навукі і культуры.

*У музеях (аддзелах) прыродазнаўча-гістарычнага профілю:*

- узоры прыроды, апрацаваныя і закансерваваныя для доўгатэрміновага захоўвання, а таксама забяспечаныя этыкеткамі, якія гарантуюць дакладнасць вызначэння;
- унікальныя аб'екты жывой і нежывой прыроды, напрыклад, рэдкія віды жывёл і раслін, метэарыты, крышталі незвычайнай формы і інш.;
- зборы буйнейшых прыродазнаўцаў, якія маюць навуковае ці мемарыяльнае значэнне;
- узоры тэхнікі прэпаравання і навуковай таксідэрміі;
- біялагічныя групоўкі і дыярамы краявідаў, якія з навуковай дакладнасцю ўзнаўляюць натуральныя абставіны вывучаных музеем прыродных куткоў і грунтуюцца на сапраўдных, навукова апрацаваных матэрыялах;
- сапраўдныя выяўленчыя матэрыялы, якія характарызуюць прыродныя ўмовы (картаграфічныя, фатаграфічныя і творы выяўленчага мастацтва);
- пісьмовыя, выяўленчыя, рэчавыя помнікі, якія адлюстроўваюць гісторыю прыродазнаўчых навук.

*У музеях (аддзелах) літаратурнага, тэатральнага, музычнага профілю:*

- творы мастацкай літаратуры, драматургіі і публіцыстыкі (рукапісы, друкаваныя выданні з выпраўленнем ці аўтографамі аўтара, рэдкія друкаваныя выданні і інш.;
- дакументы, якія характарызуюць дзейнасць творчых калектываў, жыццё і творчасць пісьменнікаў, акцёраў, рэжысёраў, кампазітараў, музыкантаў, тэатральных мастакоў і іх асяроддзе;
- творы выяўленчага мастацтва, фотаздымкі, якія характарызуюць дзейнасць творчых калектываў, асобы дзеячоў літаратуры, тэатральнага і музычнага мастацтва, працэс іх творчасці, час, у якія яны жылі;
- эскізы і макеты дэкарацый, эскізы тэатральных касцюмаў;
- ілюстрацыі да літаратурных твораў;
- мемарыяльныя прадметы побыту, прадметы побыту, якія характарызуюць эпоху;
- музычныя інструменты, тэатральныя касцюмы і інш.;
- фоназапісы і кінафільмы.

*У музеях мастацкага профілю:*

- творы ўсіх відаў вытворчага мастацтва, дэкаратыўна-прыкладнога і манументальнага ў адпаведнасці з вузкім профілем кожнага канкрэтнага музея (жывапіс і графіка, скульптура і фрагменты архітэктуры, кераміка і шкло, вырабы з метала, дрэва, косці, каменя, мэбля).

*У музеях мемарыяльнага профілю:*

- мемарыяльныя прадметы, якія належалі славутай асобе, ці яе бліжэйшаму асяроддзю (рэчавыя, выяўленчыя, пісьмовыя помнікі, кінафотадакументы);
- мемарыяльныя прадметы, якія тычацца асвятляемай падзеі (рэчавыя, выяўленчыя, пісьмовыя помнікі, кінафотадакументы);
- творы літаратуры і мастацтва, прысвечаныя славутай асобе ці з'яве.

## Да навукова-дапаможнага фонду адносяцца:

- \- розныя ўзнаўленні (фотакопіі, злепкі, муляжы, макеты), копіі, рэканструкцыі, мапы, дыярамы, схемы, планы, а таксама іншыя матэрыялы, выраблены ці набытыя музеем падчас камплектавання фондаў, вывучэння ці экспанавання музейных прадметаў;
- \- узоры хуткапсавальных сельскагаспадарчых культур і іншых натуральных матэрыялаў, схільных да псавання і патрабуючых частай замены.